За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 3 (86) Сакавік 2014 г.

Апазыцыйны кандыдат скардзіцца на працу выбарчых камісіяў



Вадзім Кузьмін

Сябра партыі левых «Справядлівы сьвет», падпалкоўнік у адстаўцы Вадзім Кузьмін падвяргаецца дыскрымінацыі з боку Віцебскай гарадзкой і акруговай выбарчых камісіяў. Пра гэта заявіў сам кандыдат, які вылучаецца адначасова ў гарадзкі і абласны Саветы дэпутатаў.

Так, з агітацыйных улётак, адцэнзураваных Віцебскай гарадзкой камісіяй, зьніклі дадзеныя пра тое, што кандыдат Кузьмін зьяўляецца ліквідатарам аварыі на Чарнобыльскай АЭС і мае дзяржаўныя ўзнагароды — 3 ордэны і 5 мэдалёў.

Затое на ўлётках зьявіліся іншыя зьвесткі: тое, што ён мае судзімасьць. А газэта «Віцьбічы» з падачы камісіі пайшла яшчэ далей: на сваіх старонках яна паведаміла чытачам, паводле якога крымінальнага артыкулу ён быў асуджаны, «забыўшы» пазначыць пры гэтым, што судзімасьць даўно зьнятая.

Вадзім Кузьмін паспрабаваў разабрацца ў сытуацыі, чаму так здарылася. Ён прыйшоў на паседжаньне акруговай камісіі Білеўскай выбарчай акругі № 60 разам са сваёй даверанай асобай — юрыстам. Аднак старшыня камісіі Аляксандар Хрытаненка папросту выставіў апошняга за дзьверы, чым пазбавіў спадара Кузьміна юрыдычнай дапамогі.

«Я – сябра партыі «Справядлівы сьвет». Усе гэтыя дзеяньні – гэта ціск на мяне як на апазыцыйнага кандыдата, – лічыць Вадзім Кузьмін. – Калі б я ішоў ад нейкіх уладных структур, то да мяне ніякіх заўваг не было б».

На ўчастку ў Воршы за адну гадзіну запісалася галасаваць на даму траціна выбаршчыкаў

У Воршы назіральнікаў абмяжоўваюць у магчымасьці сачыць за выбарчым працэсам. Пра такія факты паведаміў Яўген Анішчанка, сябар аргкамітэту па стварэньні партыі БХД, кандыдат у дэпутаты па Будаўнічай акрузе №3 і назіральнік на ўчастку №6 па Маладзёжнай выбарчай акрузе №8.

“Я зарэгістраваўся назіральнікам і хацеў прысутнічаць на падліку бюлетэняў, якія развозілі па ўчастках. Іх мусяць падлічыць і падпісаць сябры ўчастковай выбарчай камісіі. Але назіраць за працэсам не было магчымасьці: памяшканьне, дзе месьціцца ўчастак, было зачыненае. Ня ведаю, ці быў нехта ўнутры, ці бюлетэні падпісвалі ў іншым месцы. Такая самая карціна была на ўсіх участках у Воршы. Яны адчыніліся толькі ў 17 гадзін, і працавалі да 19, пакуль там быў дзяжурны сябар камісіі. Так што колькі бюлетэняў было атрымана, калькі іх налічылі, так і застаецца невядомым", - распавёў Яўген Анішчанка.

Зранку 18 сакавіка на ўчастку №6 ужо было зафіксавана 340 чалавек, якія нібыта выказалі жаданьне галасаваць дома, працягвае актывіст: “Мы дзяжурым на ўчастку папераменна зь Мікалаем Клешчанком, даверанай асобай кандыдата Віталя Тамашэвіча. Яму і паведамілі, што ў першую ж гадзіну галасаваньня запісаліся адразу 340 чалавек, якія хочуць, каб да іх прыехалі са скрыняй. Гэта — амаль трэцяя частка ад колькасьці ўсіх выбаршчыкаў на ўчастку, дужа шмат! Мікалай заявіў, што 23 сакавіка гатовы езьдзіць па хатах разам з прадстаўнкамі камісіі. Але яго адразу папярэдзілі, што месца ў машыне для яго няма. Дык што, калі хоча, няхай езьдзіць сьледам за сябрамі камісіі на сваім уласным транспарце".

Назіральнікі фіксуюць парушэньні на выбарчых участках у Віцебску

Назіральнікі, якія адсочваюць, як праходзіць датэрміновае галасаваньне, адзначаюць шматлікія выпадкі парушэньня выбарчага заканадаўства на ўчастках у Віцебску. Так, большасьць назіральнікаў адзначае, што на час абедзеннага перапынку скрыні для галасаваньня пакідалі пад аховай міліцыі не апячатанымі.



Сьведкам парушэньня стаў і праваабаронца Павал Левінаў: **"Падчас майго назіраньня на ўчастку №40 у Першамайскім раёне я заўважыў, як жанчына прыйшла галасаваць і пачала пра нешта цішком перамаўляцца зь сябрамі камісіі. Прыслухаўся: аказваецца, яна хацела прагаласаваць ня толькі за сябе. Але тут высьветлілася, што яна ў сьпісах суседняга ўчастку - №39. Жанчына пайшла туды, я за ёй... Пасьпеў якраз убачыць, як ёй выдавалі камплект бюлетэняў для двух асобаў. Усе адзнакі ў іх яна ставіла, нават не заходзячы ў кабіну, а заўважыўшы мяне, пачала хутка складаць паперкі. У выніку ледзьве змагла ўвапхнуць іх у вузкую шчыліну, і ў празрыстай скрыні добра відаць, што складзеныя бюлетэні – гэта не адзін камплект, які мусіць выдавацца асабіста выбаршчыку, а некалькі"**.

Вадзіму Кузьміну, які прысутнічаў у якасьці назіральніка на ўчастку №35, што ў Першамайскім раёне, выбарчая камісія адмовілася паведаміць зьвесткі пра колькасьць выбаршчыкаў, колькасьць бюлетэняў і колькасьць тых, хто хоча прагаласаваць на даму.

Вадзім Кузьмін распавядае: **"Я напісаў скаргу на імя старшыні ўчастковай камісіі, што ўтойваньне гэтых лічбаў разглядаю як стварэньне магчымасьцяў для парушэньня закону і фальсыфікацыі выбараў. Не магу ўстрымацца, каб не працытаваць адказ старшыні Ігара Керасёва. Ён напісаў літаральна наступнае: "Гэты фальшывы і гнюсна паганы опус я пакідаю без задавальненьня і разглядаю яго як спробу стварэньня перашкодаў для правядзеньня выбараў"**.

Гэты "адказ" старшыні ўчастковай камісіі Вадзім Кузьмін накіраваў на разгляд у пракуратуру і абласную выбарчую камісію. Давялося накіраваць туды адразу некалькі скаргаў. Адна зь іх — на сумнеўныя ўмовы захаваньня скрыні для бюлетэняў, працягвае актывіст:

"Участак №35 месьціцца ў доме 25\2 па вуліцы Чкалава, гэта спартова-культурны цэнтар "Адзінства" пры ЖЭУ №21. Уласна ўчастак знаходзіцца ў спартовай залі. Калі яго зачынялі на абедзенны перапынак, я спытаўся, як будзе захоўвацца скрыня. Мне сказалі, што тут і будзе, пад аховай міліцыянта. Я вырашыў дзяжурыць таксама, ужо пад дзьвярыма. І ўбачыў, што а 15:30 да дзьвярэй памяшканьня падыйшоў чалавек з "дыпляматам". Мне ён сказаў, што ён "мантэр", а потым пастукаўся, і міліцыянт яго пусьціў унутар! Калі праз некалькі хвілін зьявіліся старшыня і сябры камісіі, я пра гэта ім паведаміў. Старшыня камісіі зноў пачаў папракаць мяне ў грубай форме за "спробы сарваць выбары". Але як толькі ён зайшоў туды, невядомы чалавек з "дыпляматам" выскачыў з памяшканьня і кінуўся наўцёкі. У памяшканьні, дзе не мусілі знаходзіцца пабочныя асобы, ён прабыў амаль паўгадзіны. Але мне не далі праверыць, ці цэлыя пломбы на скрыні для галасаваньня. І ўвогуле пасьля гэтага інцыдэнту стаўленьне да мяне стала больш жорсткім. Мне нават забаранілі падымацца зь месца, каб нешта ўбачыць на ўчастку".

Аляксей Гаўруціўкаў пацярпеў ад цэнзуры дубровенскай газэты

Віцебскі незалежны кандыдат у дэпутаты абласнога савету ня змог скарыстацца сваім правам надрукаваць агітацыйныя матэрыялы ў дубровенскай раённай газэце. У гэтым яму адмовіла рэдактарка дзяржаўнага выданьня. І ЦВК у адказе на скаргу Аляксея Гаўруцікава падтрымаў гэтую пазыцыю, маўляў, “мае права адмовіць”.



Аляксей Гаўруцікаў

Рэдактар “Дняпроўскай праўды” Сьвятлана Шурпакова заявіла, што ў праграме кандыдата ўтрымліваецца “прыхаваны заклік да зьмяненьня канстытуцыйнага ладу і зьмены ўлады”. І таму агітацыйныя матэрыялы надрукаваныя ня будуць.

“Кожны кандыдат мае права скарыстацца сродкамі выбарчага фонду і надрукаваць свае агітацыйныя матэрыялы ў СМІ. Гэта маё права! І рэдактар ня можа ладзіць нейкую цэнзуру. Заўвагі мне мусіць рабіць выбарчая камісія, а не рэдактар. Тым больш, што гэты тэкст рэдактары ўжо бачылі: я агучваў яго падчас радыёвыступу, і заўвагаў да мяне не было. Таму я напісаў скаргі на дзеяньні Сьвятланы Шурпаковай у пракуратуру і ў ЦВК”, - распавёў кандыдат.

З адказу, які Аляксей Гаўруцікаў атрымаў з ЦВК, вынікае, што кандыдат, вядома, мае права на публікацыі матэрыялаў, толькі вось СМІ таксама мае права — адмовіць.

“Мне адказалі, што паводле закону аб СМІ ніхто ня мае права змусіць выданьне надрукаваць адхіленыя матэрыялы. І што выбарчае заканадаўства рэгулюе толькі грашовыя ўзаемаадносіны паміж кандыдатам і СМІ. Дык што маё права на публікацыі цалкам перакрэсьленае правам выданьня нічога не друкаваць. І нават без тлумачэньня прычын,” — кажа Аляксей Гаўруцікаў.

Для віцебскага апазыцыянэра, актывіста аргкамітэту па стварэньні Сацыял-дэмакратычнай партыі “Народная Грамада”, такая супярэчнасьць ужо не зьяўляецца чымсьці зусім новым: “Гэта нагадвае сытуацыю з масавымі акцыямі ў Віцебску. Усе нібыта маюць права іх арганізоўваць і праводзіць, але віцебскі гарвыканкам запатрабаваў, каб разам з заяўкай да іх прыносілі дамовы на абслугоўваньне акцыяў структурамі ЖКГ, міліцыяй і мэдыкамі. Дык вось гэтыя структуры з намі папярэднія дамовы заключаць адмаўляюцца, і прымусіць іх таксама нельга. Атрымліваецца тое самае: мы маем права праводзіць пікет ці мітынг, але адказныя асобы маюць права не заключаць з намі дамовы. У выніку ніводнай масавай акцыі па ініцыятыве віцебскіх актывістаў за апошнія 4 гады так і не дазволілі”.

Ярмошына пагадзілася з Тацьцянай Севярынец



Тацьцяна Севярынец

Каардынатар аргкамітэту па стварэньні партыі “Беларуская хрысьціянская дэмакратыя” ў Віцебскай вобласьці **Тацьцяна Севярынец** атрымала адказ ад старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзіі Ярмошынай на тое, што назіральнікі на выбарчым участку №46 у Віцебску ня мелі магчымасьці аглядаць падлік галасоў.

Урывак з адказу ЦВК зачытала Тацьцяна Севярынец: *“Нягледзячы на тое, што чальцы ўчастковых камісіяў бралі непасрэдны ўдзел у трэнінгах, ня ўсе яны, на жаль, належным чынам выконвалі рэкамэндацыі ЦВК. З улікам гэтага, пры правядзеньні наступных выбарчых кампаніяў асаблівая ўвага будзе скіраваная на неабходнасьць больш дакладнага выкананьня арганізатарамі выбарчага працэсу рэкамэндацыяў Цэнтральнай камісіі”.*

Тацьцяна Севярынец была вельмі зьдзіўлена такому адказу, які фактычна прызнаў парушэньні на яе выбарчым участку. Бо на падобныя шэсьць скаргаў яе калегі па назіраньні атрымалі адказы-адпіскі. “Магчыма, нехта добрасумленны ў ЦВК так добра падрыхтаваў адказ і падсунуў на подпіс Ярмошынай”, - адзначае назіральніца.

Перастараліся: у выбарчай акрузе «прагаласавала» людзей больш, чымся значыцца ў сьпісе выбаршчыкаў

У выніковыя пратаколы выбарчых камісіяў, якія нібыта сумленна, нібыта лічаць, нібыта галасы на нібыта выбарах часам ніхто нават не зазірае. Прыклад - інфармацыя пра вынікі галасаваньня на выбарах у мясцовыя саветы, якая разьмешчаная на сайце Гарадоцкага райвыканкаму Віцебскай вобласьці.

Тут знайшлася дзіўная, проста нейкая чароўная акруга - Студэнцкая выбарчая акруга № 3. Паводле афіцыйнай інфармацыі, тут у сьпісы выбаршчыкаў былі ўключаныя 699 чалавек, узялі ўдзел у галасаваньні 657 - 94% выбаршчыкаў. «За» кандыдата, нейкую Галіну Аляксандраўну Сімураву, дырэктара мясцовага цэнтру дзяцей і моладзі, прагаласавала 409 чалавек. «Супраць» - 241. Несапраўдных бюлетэняў - 77.

Пытаньне: Хто і як ўкідваюць бюлетэні на гэтай акрузе, калі ўдзел у галасаваньні ўзялі 657 чалавек, права голасу мелі 699 чалавек, а бюлетэняў аказалася ажно 727?!

Зрэшты, на беларускіх выбарах пытаньні задаваць ня прынята...

За пікет у падтрымку байкоту выбараў палітык трапіў за краты

7 сутак арышту – такі вэрдыкт у дачыненьні да актывіста Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ Яна Дзяржаўцава вынесла 26 сакавіка судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску Натальля Караблiна. Партыец пакараны паводле артыкулу 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых мерапрыемстваў) за ўдзел у пікеце супраць «выбарчага фарсу» ля выбарчага ўчастку 22 сакавіка.


Ян Дзяржаўцаў

У якасьці доказу зьдзяйсьненьня правапарушэньня судзьдзя выкарыстала 1-хвілінны ролік, зьмешчаны ў Інтэрнэце. Судзьдзя ня стала абцяжарваць сябе высьвятленьнем таго, хто менавіта зьняў і апрацаваў гэты ролік, і яе не зьбянтэжыў той факт, што на роліку відавочныя сьляды мантажу. Каб прагледзець відэа падчас судовага працэсу, у паседжаньні быў зроблены перапынак на гадзіну: файл на дыску, які знаходзіўся ў матэрыялах справы, не адчыняўся. Падчас перапынку судзьдзя Караблiна здабыла недзе іншы дыск, і запіс на ім стала падставай для пакараньня сябра КХП-БНФ.

Затрыманы Ян Дзяржаўцаў быў напярэдадні: у суд яго прывезьлі з ізалятару часовага ўтрыманьня, дзе ён правёў ноч. Актывіст распавёў у судзе, што міліцыянт, які складаў пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні, сказаў яму, што лічыць, што няма падставаў для зьмяшчэньня яго ў ІЧУ да суду, і выпісаў позву ў суд на 3 красавіка, — але паступіў загад аднекуль згары, каб працэс быў паскораны.

У судзе Ян Дзяржацаў прызнаў, што сапраўды парушыў рашэньне Віцебскага гарвыканкаму, паводле якога каб атрымаць дазвол на правядзеньне масавых мерапрыемстваў і пікетаў ад мясцовых органаў улады, трэба сьпярша заключыць дамовы зь міліцыянтамі, камунальнікамі і мэдыкамі, якія ад заключэньня гэткіх дамоў усяляк ухіляюцца. На парушэньне актывіст пайшоў сьвядома, бо цягам апошніх гадоў колькі разоў ён і іншыя дэмакратычныя актывісты падавалі заяўкі на пікеты, і ніводнага разу ніхто не атрымаў дазволу на іх правядзеньне.

«Я кіраваўся Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі дамовамі, якія Рэспубліка Беларусь падпісалі, у прыватнасьці Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правох. Гэтыя прававыя акты забясьпечваюць маё права на вольнае выказваньне свайго меркаваньня, у тым ліку і празь пікет», – заявіў Ян Дзяржаўцаў.

Тым ня менш судзьдзю Караблiну ён не пераканаў. Відаць, яна палічыла, што рашэньне Віцебскага гарвыканкаму № 881 ад 10 ліпеня 2009 году «Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску» і Закон «Аб масавых мерапрыемствах» маюць прыярытэт вышэйшы за Канстытуцыю і нормы міжнароднага права.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.